УДК 357. 23 (091) “1912-1914” (476.6)

# ДА ГІСТОРЫІ АРГАНІЗАЦЫІ СТАЦЫЯНАРНАГА МЕТЭАНАЗІРАННЯ Ў ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ НА ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ

**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Навуковы падыход да развіцця сельскай гаспадаркі звязаны не толькі з распрацоўкамі ў галіне вырошчвання раслін і жывёлы, тэхнічным забеспячэннем вытворчасці, але і з больш шырокім выкарыстаннем звестак пра навакольнае асяроддзе, у тым ліку пра асаблівасці клімату. Залежнасць сельскай гаспадаркі ад апошняга стала адной з прычын з’яўлення спецыяльных метадаў і сродкаў назірання за прыродай, але сістэма метэаралагічных дадзеных у сённяшнім выглядзе сфармавалася не так даўно. Першыя сталыя метэапункты на тэрыторыі Гарадзенскай губерні паўсталі яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя, але да абслугоўвання патрэб сельскай гаспадаркі яны мелі ўскосныя адносіны. Толькі запозненая мадэрнізацыя беларускай вёскі, якая стартавала пасля адмены прыгону, стала паступова разбураць сцяну паміж навукай і сялянствам. Сваю ролю ў гэтым адыграла ўсведамленне карысці ад метэаралогіі. Асобны эпізод у гэтай гісторыі, датычны Гарадзеншчыны, меў месца больш ста гадоў таму назад.

На пачатку ХХ стагоддзя Гарадзенская губерня даволі актыўна стала далучацца да дзяржаўных мерапрыемстваў, накіраваных на якаснае паляпшэнне сельскай гаспадаркі. Дзеля гэтага распачаў працу такі орган, як Гарадзенская асобная агранамічная нарада. Вырашаючы розныя пытанні арганізацыі навуковай і тэхнічнай дапамогі насельніцтву, гэтая ўстанова некалькі разоў таксама ініцыявала стварэнне сталай сістэмы метэаназіранняў у губерні. На адным са сваіх пасяджэнняў, якое адбылося 31 траўня 1912 г., было пастаноўлена стварыць чатыры метэаралагічныя станцыі: тры так званага 2-га разраду ў :

- г. Кобрыне;
- в. Таракані Кобрынскага павета;
- в. Стрыгіна Слонімскага павета;

і адну 3-га разраду ў в. Грыгораўцы Бельскага павета.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Адпаведнае прашэнне ад імя гарадзенскага губернатара было накіравана ў профільную дзяржустанову – Мікалаеўскую Галоўную Фізічную Абсерваторыю ў Санкт-Пецярбург [1, арк. 1].

Заяўка гэта трапіла ў Абсерваторыю ў сярэдзіне чэрвеня, а адказ, так званыя «адносіны», быў складзены толькі праз месяц – 13 ліпеня 1912 г. Гэты службовы дакумент дайшоў да гарадзенскай губернскай канцылярыі 16 ліпеня і ў той жа дзень быў засведчаны пячаткай Гарадзенскай асобнай агранамічнай нарады пад № 866 [1, арк. 2-2 адв]. Адказ быў адрасаваны губернатару, а складзены ад імя тагачаснага дырэктара абсерваторыі акадэміка Міхаіла Рыкачова [1, арк. 2-2 адв]. Дырэктар абсерваторыі паведамляў, што не можа маштабна дапамагчы *«Гарадзенскай агранамічнай арганізацыі»* па прычыне недахопу сродкаў. Адзінае, што прапаноўвала Абсерваторыя, была «дажджамерная прылада», якая магла быць выслана для станцыі ў Стрыгіне. Адносна арганізацыі станцыі ў в. Грыгораўцы ад Абсерваторыі паступіла просьба аб правядзенні папярэдняй інфармацыі, якую належала сабраць у адпаведнасці з далучанымі да адказу апытальнымі бланкамі і выслаць назад. Па выніках гэтага Абсерваторыя абяцала паведаміць пра магчымасць прадастаўлення яшчэ адной «дажджамернай прылады». Асобна губернатара прасілі прасачыць за рэгулярнасцю высылкі звестак у Абсерваторыю, калі яна ўсё ж «адшукае сродкі для абсталявання» станцый. [1, арк. 2 адв.]. Рэзюмаваў гэта ліставанне губернатарскі адказ ад 21 ліпеня 1912 г. на адрас Абсерваторыі, дзе, паведамляючы аб высылцы апытальнага лістка з в. Грыгораўцы, канстатавалася, што з-за немагчымасці атрымаць абсталяванне ад Абсерваторыі і «адсутнасці ў Агранамічнай нарады сродкаў» арганізацыя станцый не адбудзецца [1, арк. 3].

Але надзённасць справы вымушала Агранамічную нараду не адкідаць надзею па арганізацыі станцый, магчыма, нават на свае сродкі. Так, у ліпені наступнага 1913 г. на імя губернскага агранома паступіла паведамленне ад Слонімскай землеўпарадкавальнай камісіі, дзе паведамлялася, што аграном А. П. Міраў дамовіўся пра арганізацыю метэаралагічнай станцыі на хутары селяніна Фёдара Казінца (ён меўся і збіраць дадзеныя) ля вёскі Новая Пескаўскай воласці [2, арк. 22.].

Чарговы віток адносін з Мікалаеўскай абсерваторыяй адбыўся ў 1914 г., калі ўжо ад імя губернскага агранома была складзена лаканічная даведка пра стан метэаралагічнага назірання і патрэбу яго развіцця. У сваім пасланні ад 1 ліпеня 1914 г. губернскі аграном канстатаваў, што у Гарадзенскай губерні даволі мала станцый, між тым: *«Сельскія гаспадары і аграномы адчуваюць вялікі недахоп*



РЭПАЗІТОРЫЙ ГрДУ

*метэаралагічных звестак па тэрыторыі губерні: адсутнасць звестак пра тэмпературу паветра і глебы, памерах ападкаў, моцы і накірунках вятроў, колькасці воблачных і бязвоблачных дзён, ходзе бараметрычнага ціску і інш., што з'яўляецца стрымліваючым фактарам увядення новых прыбытковых раслін, новых сартоў мясцовых раслін, і не дазваляе правесці своечасовую апрацоўку палеў пад розныя культуры і г. д.»* [2, арк. 1]. У сувязі з гэтым гарадзенскі губернскі аграном нагадаў кіраўніцтву Абсерваторыі пра папярэднюю няўдалую просьбу атрымаць дапамогу ў арганізацыі метэастанцый і паўторна прасіў даслаць абсталяванне ў вёскі Стрыгін, Таракань, а таксама ў вескі Вылудкі Сакольскага павета і Вялікае Дабрынава Беластоцкага павета, паколькі там *«стала жывуць сябры нашай агранамічнай арганізацыі і ім, за невялікую ўзнагароду, можна даручыць весці назіранне»* [2, арк. 1-1 адв.].

Аднак і на гэты раз за кошт Абсерваторыі не ўдалося нічога змяніць. 17 ліпеня 1914 г. быў падрыхтаваны адказ за подпісам памочніка дырэктара абсерваторыі Э. Штэлінга, дзе канстатавалася, што ў бягучым годзе Абсерваторыя не зможа абсталяваць станцыі ў пазначаных месцах, паколькі яны не ўвайшлі ў *«план развіцця сеткі»*, але ў будучым просьбу з Гродна абяцалі ўлічыць. Адзінай рэальнай дапамогай была прапанова выслаць чатыры дажджамеры для плануемых станцый, для арганізацыі іх па трэцім разрадзе. Плюс Абсерваторыя выслала інструкцыі па зборы метэаралагічнай інфармацыі і чатыры асобніка «даведачнага лістка». Абяцанне з боку Абсерваторыі абсталяваць станцыі таксама мела адну ўмову – гэта рэгулярны збор неабходных звестак [2, арк. 2-2 адв.].

На вялікі жаль, гэтыя задумы так і засталіся ў планах, так як нават «даведачныя лісткі» Абсерваторыі не былі разасланыя і засталіся ў архіўнай справе разам з інструкцыямі [2, арк. 3-21 адв.]. Увасобіць прапановы гарадзенскіх аграномаў перашкодзіла Першая сусветная вайна, якая пачалася ў ліпені 1914 г.

**ЛІТАРАТУРА**

1. НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 1. спр. 26.
2. НГАБ у Гародні. Ф. 868. В. 1. спр. 34.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ